ности. Мн., 1956; Варфоломеева Т.Б. Северобелорусская свадьба. Мн., 1988; Пилипенко М.Ф. Возникновение Белоруссии. Мн., 1991; Карскі Я. Беларусы. Мн., 2001; Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Кн. 2. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр. Мн., 2001.

*М.Ф. Пілipенка.*

**СТАЎБУ́НСКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНА-ЭТНАГРАФІ́ЧНЫ АНСА́МБЛЬ «СТАЎБУ́НСКІЯ ВЯЧО́РКІ»** сельскага Дома культуры Веткаўскага раёна. Заснаваны ў 1982, з 1997 народны. Кіраўнік — С.Парашчанка. У рэпертуары мясцовыя песні каляндарна-абрадавага (велікодныя — «А на Вялікі дзень, ой, на Вялікадня»; ушэсцевыя — «Я скакала, плясала», «Ой, ідзі, страла», «На гарэ лён», «Пацярала ключы», «А ў садзіку, пад грушыю», «Па вуліцы па шырокай», «Як у нашым у сяле паявілась навіна»; веснавыя — «Наша вуліца была шырокая», «У лесе на паляне», «Мамачка, мая ты ягадка», «Не калышыся, асіначка»; жніўныя — «Закацілася, завалілась жаркае сонейка», «Ай, мамачка мая родная», «А ну, цётка, маладыя жнейкі», «Як пайду я лугам, далінаю», «Паеду ў поле я з сахою» і інш.) і сямейна-абрадавага (вясельныя — «Ляцелі галачкі», «У лесе, на паляне», «У лузе, на лужочку», «Чыя ета рута, мята», «Ой, барком, барком», «У лесе, у лясочку», «Выйдзі, мамачка, паглядзі», «У саду зязюля кукуе», «Не стой, мамачка, на куце») цыклаў, мясцовыя танцы («Страданія», «Нарэчанька», «Базар», «Падыспань», «Карманчыкі», «Кракавяк», полька «Сербіянка» і інш.). Паставіў абрады Дабравешчанне, Вяселле, Каляды, Пахаванне «стралы», Ушэсце. Калектыў — дыпламант Рэспубліканскага фестывалю нар. танца «Беларуская полька» (г. Чачэрск, 1996, 1999), удзельнік фестывалю нар. музыкі «Звініць, звініць канкляй» (Вільнюс, 1986). Выступаў на Бел. тэлебачанні.

*А. І. Гурчанка.*

**СТАЎРЫ І ГА́ЎРЫ**, у бел. народных легендах фігуруюць як сабакі (псы) князя Боя, а таксама як сабакі першапасяленца Бая, якія засталіся ў спадчыну яго сыну Белаполю, ад якога і пайшлі беларусы. Змест легенд, у якіх апавядаецца пра С. і Г., сведчыць пра водгалас татэмістычных вераванняў. С. і Г. — добрыя, дужыя, кемлівыя паляўнічыя сабакі, якія маглі ўзяць любога звера, а таксама і птушак, умомант адолець



*Стаўбунскі народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Стаўбунскія вячоркі».*

мядзведзя. У легендах Белаполь пускае сваіх сабак за птушкамі, якія прыляцелі з розных бакоў. Па слядах сабак «працягнуліся» дзве ракі: у адзін бок пацякла Дзвіна, у другі — Днепр. Аб сувязі нар. уяўленняў пра С. і Г. з язычніцкімі гаворыць адлюстраваны ў «Матэрыялах...» П.Шэйна факт існавання ў колішнім Барысаўскім павеце, каля Докшыц, Стаўроўскіх дзядоў, якія ладзіліся перад *Сёмухай*.

*Літ.*: Легенды і паданні. Мн., Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1, ч. 2. СПб., 1890.

*А. В. Цітавец.*

**СТОД**, гл. *Ідалы.*

**СТОЛ**. У традыцыйнай культуры беларусаў С. з'яўляўся неад'емнай часткай хаты, яе рытуальна маркіраваным цэнтрам, вакол якога разгортваліся асноўныя падзеі сямейна-родавых свят. З пашырэннем хрысціянства С. пачалі параўноўваць з прастолам боскім, а таму паводзілі сябе за ім як у царкве. Часцей за ўсё ён знаходзіўся на дыяганалі, якая звязвала парог (печ) і чырвоны кут. Накіраванасць яго размяшчэння адпавядала асноўным сілавым лініям жыллёвай прасторы — паралельна дошкам падлогі і столі або сцяне з боку гаспадарчага двара. С. абавязкова засцілалі абрусам і ўважліва сачылі, якім бокам ён засланы («левы» бок абруса сімвалізаваў выключанасць з паўсядзённага жыцця — жалобны стол). У кожнага члена сям'і было сваё месца за С., дакладна вызначанае яго сямейным, сацыяльным і ўзроставым статусам. Гаспадар сядзеў на самым пачэсным месцы — у чырвоным куце пад абразамі ў тарцы С. Абедруч ад яго сядзелі старэйшыя мужчыны, за імі — малодшыя. Жанчыны садзіліся ў кан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Столінскі заслужаны аматарскі ансамбль народнай музыкі «Выцінанка».*

цы С. Самае пачэснае месца жанчына магла займаць толькі ў выключным выпадку, напрыклад, як хросная маці на Хрэсьбінах або Вяселлі свайго хрэсніка. Гаспадыня, якая гатавала ежу, часам зусім не сядала за С., а сілкавалася пасля таго, як пад'есць уся сям'я. Гаспадар заўсёды першым сядаў за С. (пасля яго садзіліся астатнія члены сям'і ў адпаведнасці з узростам), першым спрабаваў ежу, справядліва дзяліў яе паміж членамі сям'і, сачыў за парадкам. Па славянскім звычаі есці трэба было ціха, павольна, размовы дапускаліся толькі па гаспадарчых справах. Асабліва строга адносіліся да гэтага пасля заходу сонца. Да заканчэння трапезы з-за С. можна было выходзіць толькі з дазволу гаспадара. За святочным С. муж і жонка абавязкова сядзелі побач (плячо ў плячо), што сімвалізавала адзінства і непарушнасць сям'і. Толькі жалобны С. быў выключэннем: з аднаго боку С. (уздоўж сцяны) садзіліся мужчыны, з другога (бліжэй да печы) — жанчыны. Рассаджваліся абавязкова па ўзросце: старэйшыя — бліжэй да чырвонага кута, каб вытрымаць правіла «не лезь паперад (папярод) бацькі ў пекла». Муж і жонка садзіліся адзін насупраць другога ў роўнай аддаленасці ад чырвонага кута і зоны смерці, жадаючы для сябе тое, што было сфармулявана ў нар. выслоўі: «У адзін дзень павянчаліся, у адзін дзень і памерлі». Існаваў шэраг этыкетных прадпісанняў, звязаных з паводзінамі за С. Нельга, каб за С. адначасова знаходзілася 13 чалавек, гэта акалічнасць несла з сабою бяду і няшчасце. Пільна сачылі за тым, каб ніхто не грукаў па С., бо лічылі, што С. — гэта «далоня Бога, працягнутая людзям». З-за С. выходзіць не спяшаліся: «Колькі прабудзеш за сталом, столькі і ў царстве нябесным будзеш». Выходзячы з-за С., абавязкова дзякавалі Богу. Калі ўдзячнасць гучала ў бок гаспадароў, яны імкнуліся як мага хутчэй перадрасаваць яе Нябёсам. Існавала правіла, што выходзіць з-за С. трэба было з таго боку, з якога заходзіў. З тым, хто парушаў правіла, маглі адбыцца самыя непрадказальныя падзеі (не будзе жыць хрэснік, памрэ хтосьці са сваякоў, у сям'і будзе сварка, згубіцца ў лесе і інш.). Падчас асноўных сямейнародавых свят С. набываў самы высокі абрадавы статус, быў актыўна ўключаны і ў кантэкст абрадаў пераходнага характару. У выключных рытуальных сітуацыях тры разы абыходзілі С.: падчас родаў бабка-павітуха абводзіла парадзіху вакол С.; пасля хрышчэння хросныя бацькі абносілі дзіця вакол С. (абрад «Хаджэнне ў рай»); перад тым, як пайсці да вянца, жаніх і нявеста тройчы абыходзілі С. Калі прыходзілі сваты, сваццproperty абвязвала ножкі С. поясам, каб «Вяселле завязалася». Нявеста, калі выходзіла з хаты, цягнула за сабой С., каб сяброўка таксама хутка ўзяла шлюб. За С. дзялілі вясельны Каравай. Набытых курэй вярцелі вакол ножкі С. і казалі: «Як С. з хаты ніколі не выходзіць, так бы і вы, куры, з двара не збеглі!». Перад доўгім і цяжкім шляхам чалавек імкнуўся атрымаць падтрымку сакральнага месца хаты — С., для чаго тройчы цалаваў яго. С. цалавалі і па вяртанні дадому. Перад тым, як выйсці ў поле сеяць, уся сям'я абавязкова збіралася за С. Калі пачыналі будаўніцтва хаты, на месцы будучага чырвонага кута абавязкова ставілі С. Прымячалі, калі С. хістаецца, хутка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

памрэ гаспадар. Калі дзяўчына ў размове з хлопцам абапрэцца (прысядзе) на С., яна ніколі не выйдзе замуж. Грахом было скідаць на падлогу крошкі са С. Іх збіралі і аддавалі птушкам. Пасля ежы абавязкова прыбіралі посуд, інакш уначы магла наладзіць сабе С. «нячыстая» сіла. Непрыбраным С. пакідалі на ноч толькі ў дні ўшанавання продкаў: на Радаўніцу, Дзяды. На Гомельшчыне і сёння існуе звычай не мыць посуд тры дні пасля таго, як хтосьці з членаў сям'і некуды з'ехаў. У народзе прымячалі: калі хтосьці з членаў сям'і закашляецца за С. — нехта спяшаецца ў госці; калі упусціць ежу, якую нясе да рота, — яму нехта зайздросціць. На С. нельга было садзіцца, забаранялася класці пабочныя рэчы (асабліва грэбень, нож, грошы, ключы, шапку, торбу). Прыгатаванне святочнага С. заўсёды пачыналася з таго, што першым на сярэдзіну клалі бохан непачатага хлеба — лепшы знак сямейнага дабрабыту і багацця.

*Літ.*: Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001.

*А. В. Катовіч.*

**СТО́ЛІНСКІ ЗАСЛУ́ЖАНЫ АМА́ТАРСКІ АНСА́МБЛЬ НАРО́ДНАЙ МУ́ЗЫКІ «ВЫЦІНА́НКА»** гарадскога Дома культуры. Заснаваны ў 1981, з 1992 народны, з 2004 заслужаны. Кіраўнік — П.Астапчук. У творчасці ансамбль імкнецца да захавання палескага каларыту нар.-песеннай мелодыкі, самабытнай традыцыйнай культуры рэгіёна. У рэпертуары пераважна музычны фальклор Століншчыны: песні («Качата-гусята», «Косары косяць — віцер повівае», «Розмай», «Выйду, выйду на вуліцу» і інш.), мясцовыя танцы («Лявоніха», «Скокі ў бокі», «Шыбар», «Трасуха», «На каляно», «Шэро», «Кракавяк», «Падыспань», вальсы «Палескі», «Гусары-баламуты», полькі «Асаўская», «Шабасоўка», «Пастушок», «Выцінанка», «Паніжанская» і інш.), а таксама музычныя кампазіцыі («Столінскія музыкі», «Палеская вязанка») і інш. Адноўлены абрады Вяселле, Калядкі, «Давыд-Гарадоцкае вено». Калектыў — дыпламант міжнародных фестываляў фальклору ў Алжыры (г. Тызі-Узу, 1989), Францыі (г. Брэйдзюн, 2000), Польшчы (г. Бельска-Бяла, 2002), «Каляда—2004» (г. Роўна, Украіна), усходнеславянскіх культур (г. Цярэспаль, Польшча, 2004), лаўрэат міжнародных фестываляў «Галасы Палесся» (г. Іванава, 1996), нар. музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы, 1997), «Палескі карагод» (г. Пінск, 2000), удзельнік фестывалю Т.Касцюшкі (г. Мехаў, Польшча, 2002), Рэспубліканскага свята «Дажынкі».

*Г. І. Лямачка.*

**СТО́ПАК**, галоўны герой *сатырычнай казкі* «Мужык і пан» сюжэтнага тыпу СУС 2040 «Усё добра». Запісана А.Сержпутоўскім ад казачніка *Рэдкага.* С. павінен выканаць далікатнае даручэнне эканома: паведаміць пану пра сумныя здарэнні, якія адбыліся ў маёнтку. Пачынае ён з дробязі — зламаўся панскі сцізорык, якім спрабавалі зняць скуру з панскага выжла. Далей высвятляецца, што выжал здох, бо абʼеўся каніны, а конь здох, бо падарваўся, калі на ім вазілі ваду, каб тушыць панскі двор, які загарэўся ад свечак, што палілі каля нябожчыцы-маці. Але пану даў Бог і прыбытак: панская дачка нарадзіла сына — выліты панскі хурман Мікіта... С. у казцы надзелены пачуццём уласнай годнасці, дасціпнасцю, смеласцю. Ён не спяшаецца пачаць сваё паведамленне, прымушае пэўны час чакаць і лёкая, і пана, спакойна апавядае пра сумныя падзеі і адказвае на пытанні, а ў канцы падае «прыемную» навіну пра нараджэнне ўнука, ад якой «пан зваліўся з крэсла». Характарызуючы свайго героя, казачнік заключае: «Дак от які быў Стопак і як ён умеў з панамі гаварыць».

*Літ.*: Сержпутовский А.К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков. СПб., 1991; Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Кн. 4. Народная проза. Мн., 2002.

*К. П. Кабашнікаў.*

**«СТРАЛА́»**, Ваджэнне і пахаванне «стралы», старадаўні магічны аграрна-ахоўны абрад, звязаны з язычніцкім культам *Перуна.* Часавая прымеркаванасць абраду да веснавога культу сведчыць, што яму надаваўся важны сэнс як аднаму з падрыхтоўчых этапаў, ад якога залежаў плён працы і жыццё чалавека. Абрад праводзіўся ад *Дабравешчання* (Звеставання) да *Ушэсця.* Найчасцей на Ушэсце, калі выразна выяўляўся яго «праводны» характар і функцыянальная прызначанасць — магічна-аграрная і ахоўна-засцерагальная з мэтай забяспечыць добрую вільготнасць для пасеянага і захаваць ад перуновага агню. На карысць Ушэсця сведчаць і дзень свята

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ